# ГІСТОРЫКІ ВІЦЕБСКА 2-Й ПАЛОВЫ XX – ПАЧ. XXI СТ.: КАНЦЭПЦЫЯ ВЫДАННЯ

М.В. Півавар (Віцебск, Беларусь)

У сучаснай беларукай мове ёсць некалькі дэфініцый слова "гісторык". 1. Вучоны, які займаецца зборам і інтэрпрэтацыяй гістарычнай інфармацыі шляхам правядзення даследаванняў, працы з архіўнымі матэрыяламі і дакументамі. 2. Чалавек, які вывучае гісторыю і публікуе па ёй матэрыялы. 3. Настаўнік гісторыі ў школе ці іншай навучальнай установе. У першым выпадку, гэта навукоўца, прафесійны гісторык, для якога заняткі гісторыяй з'яўляюцца ягонай прафесіяй. Як правіла, гэта выкладчык вну, супрацоўнік навуковай ўстановы, архіва, музея. У дуругім выпадку, гэта аматар, бо яго заняткі гісторыяй не з'яўляюцца ягонай праца, а замілаваннем, якім ён займаецца з цікавасці, любапытства, пачуцця грамадскай адказнасці і інш. У трэцім выпадку – чалавек, які навучае гісторыі моладзь.

У 2006 г. выйшла кніга "Даследчыкі Полацка-Віцебскай даўніны XVI ст. – 1944 г." У ёй была змешчана інфармацыя пра больш 350 асоб, якія займаліся вывучэннем Віцебшчыны ў азначаны перыяд. У 2010 г. у кнізе "Краязнаўцы Віцебшчыны другой паловы XX – пачатку XXI ст" была змешчана інфармацыя пра 573 навукоўца і аматара роднага краю, якіяы вывучалі Віцебскую вобласць у другой палове XX ст. Па-за ўвагай засталіся даследчыкі і выкладчыкі, якія працавалі на Віцебшчыне, але не займаліся вывучэннем рэгіёну. Маладаследаванным застаецца пытанне сучасных гісторыкаў Віцебшчыны.

У кнізе Карзенка "Гісторыкі Беларусі на пачатку XXI ст. змешчана кароткая інфармацыя пра больш 400 навукоўцаў краіны. З іх усяго 4 з Віцебска. Колькі ж іх насамрэч? Які маюць навуковы і выхаваўчы патэнцыял? Як найлепш ім скарыстацца? Калісці Віцебск адыгрываў значна большую ролю ў навуковым і культурным жыцці беларускіх зямель. Тут дзейнічаў першы дзяржаўны архіў – Цэнтральны архіў старажытных актавых кніг Віцебскай і магілёўскай губерній, першая вну (Полацкая езуіцкая акадэмія (1812–1820), Віцебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута (1911–1922), Віцебскі настаўніцкі інстытут (1910); першая навуковая ўстанова (Віцебская вучоная архіўная камісія (1909–1919). Віцебшчына была прадметам вывучэння выдатных даследчыкаў – А.П. Сапунова, Е.Р. Раманава, А.М. Семянтоўскага, М.Я. Нікіфароўскага, П. Шэйна, І. Насовіча і інш. На працягу XX ст. сітуацыя змянялася не заўсёды ў лепшы бок. Архіў быў пераведзены і Віцебшчына згубіла каштоўны каштоўную дакументальную крыніцу. Тройчы ў Віцебску дзейнічаў гістарычны факультэт (1919–1924, 1933–1941, 1944–1955), але ўсю другую палову стагоддзя Віцебск не меў навуковага цэнтра па вывучэнні гісторыі. Аднаўленне яго адбылося толькі ў 2001 г., але, каб паўстала віцебская навуковая гістарычная школа трэба час, сродкі, воля і жаданне лідэраў. Пакуль бракуе ўсяго.

У гэтых умовах, важна азірнуцца, паглядзець на багаты досвет мінулага, прааналізаваць асноўныя дасягненні і пралікі, вызначыць галоўныя тэндэнцыі ў развіцці гістарычнай адукацыі і гуманітарыстыкі ўвогуле, пралічыць магчымасці і перспектывы, каб гісторыкі занялі дастойнае месца ў кіраванні і развіцці нашай дзяржавы зараз і ў будучыні.

Галоўнымі цэнтрамі працы віцебскіх гісторыкаў з'яўляліся ў другой палове XX ст. кафедры гісторыі КПСС, філасофіі, палітэканоміі, навуковага камунізма ў віцебскіх вну: ВДПІ імя С.М. Кірава, ВДМІ, ВДВІ, ВДТІЛП. Са зменамі, якія адбываюцца ў другой палове 1980-х – пач. 1990-х гг. Кафедры змянілі назвы, некаторыя прадметы перапынілі сваё існаванне, некаторыя былі ўведзены, але сутнасць іх працы засталася папярэдняя: яны забяспечваюць выкладанне ў вну прадметаў гуманітарнага цыкла. На кожнай кафедры ў розня часы працавала ад дзесятка, да 30 выкладчыкаў. Такім чынам колькасць гісторыкаў, якія працавалі ў Віцебску на працягу другой паловы XX – пач. XXI ст. блізка да 200 асоб.

Намі задумана выданне, якое будзе прысвечана гісторыкам Віцебска.

**Мэтамі выдання з'яўляюцца**:

- мемарыялізацыя асоб, якія жылі і працавалі ў Віцебску (пакінуць памяць пра гісторыкаў, якія жылі і працавалі ў горадзе);
- захаванне навуковай і педагагічнай спадчыны гісторыкаў Віцебска;
- складанне бібліяграфія даследчыкаў (тыя, што працуюць усю, тыя, што не ў Віцебску – толькі тое, што прысвечана гораду);
- выяўленне асноўных тэндэнцый развіцця гістарычнай навукі на Віцебшчыне, дасягненняў, пралікаў, выклікаў, перспектыў.

Мяркуецца, што ў яго увайдуць звесткі пра гісторыкаў, якія:

- нарадзіліся на Віцебшчыне;
- атрымалі гістарычную адукацыю ў віцебскіх вну;
- працавалі ў горадзе;
- даследавалі Віцебск, пражываючы ў іншых месцах.

Галоўнымі чыннікамі пры выбары асоб з'яўляюцца <u>навуковаць</u> і <u>значнасць вынікаў</u> іх працы. Перавагу будуць мець наяўнасць навуковага звання, ступені; праца ў ВНУ, базавая гістарычная адукацыя (як правіла). Тыя асобы, што не маюць гістарычнай адукацыі, але займаюцца вывучэннем гісторыі горада, папулярызуюць яе на аматарскіх пачатках (здараецца часам, на больш высокім узроўні) ужо знайшлі сваё

Репозиторий ВГУ

месца ў выданні “Краязнаўцы Віцебшчыны другой паловы XX – пач. XXI ст.”. Таму, у дадзеным выданні інфармацыя пра іх будзе падавацца скарочана, з адсылкай да першага выдання.

Такім чынам, асноўнымі крытэрыямі для выбару асоб сталі **значныя вынікі ў розных відах дзейнасці:**

- **навукова-даследчай** (удзел у распрацоўцы навуковых тэм, канферэнцыях, археалагічных раскопках, стварэнні музейных экспазіцый і інш.),
- **публікатарскай** (выданне манаграфій, кніг, навуковых артыкулаў, тэзісаў і матэрыялаў канферэнцый)
- **педагагічнай** (праца са студэнтамі, вучнямі (дыпломныя, перамогі ў конкурсах на лепшую навуковую студэнцкую работу, перамогі ў рэспубліканскіх алімпіядах па гісторыі, рэспубліканскіх вучнёўскіх навуковых канферэнцыях);
- **гісторыка-папулярызатарскай** (асветніцкая дзейнасць у рэспубліканскіх і мясцовых СМІ, супраца з музеямі, архівамі, бібліятэкамі, грамадскімі арганізацыямі гістарычнай і краязнаўчай накіравнасці);

У выданне не ўвайдуць гісторыкі-настаўнікі навучальных устаноў Віцебска. Асноўнымі крытэрамі іх працы выступаюць вынікі перагагічнай дзейнасці: перамогі ў рэспубліканскіх алімпіядах па гісторыі, канферэнцый, высокія дасягненні, ацэненыя наданнем ганаровых званняў “Заслужаны настаўнік” ці “Выдатнік адукацыі” і інш. Настаўнікаў-гісторыкаў у горадзе шмат. Але не ўсе маюць высокія дасягненні. Там не менш, такіх асоб шмат і яны варты асобнага выдання. Гэтую тэму пакуль адкладзем на больш позні час. А можа знойдзецца іншы даследчык, які захоча прысвяціць час, энэргію для падрыхтоўкі і выдання такой кнігі.

Інфармацыя пра асобу павінна падзяляцца на тры часткі: біяграма, бібліяграфія, літаратура. У біяграме змяшчаюцца звесткі пра асобу: час і месца нараджэння, атрыманая адукацыя, месца і час працы, дасягненні, навуковыя зацікаўленні, асобы, якія паўплывалі на фарміраванне даследчыка і інш. У бібліяграфіі змяшчаюцца матэрыялы па наступных катэгорыях: манаграфіі, кнігі; артыкулы ў навуковым друку; матэрыялы тэзісаў і канферэнцый; найбольш значныя артыкулы ў рэспубліканскім і мясцовым перыядычным друку.

Пры падрыхтоўцы вызначаюцца некаторыя праблемы, якія трэба вырашыць.

1. Выклікае складанасці *выяўленне асоб* і іх бібліяграфіі. Не ўсе сур’ёзна ставяцца да запаўнення анкеты. Пра тых выкладчыкаў, якія ўжо пайшлі з жыцця звесткі можна адшукаць часта толькі ў іх асабовых справах. Але яны не даюць уяўлення пра асобу даследчыка.
2. *Аб’ём бібліяграфіі* (колькі артыкулаў, публікацый уключаць у спіс – усю, ці пэўную колькасць). Розныя гісторыкі мелі розную публікатарскую актыўнасць. На 1960–1980-я гг. для абароны кандыдацкай дысертацыі патрабавалася толькі адзін вакаўскі артыкул, для доктарскай – тры. Цяпер умовы змяніліся. Іх трэба 3 і 20 адпаведна.

У савецкія часы амаль адутнічалі гістарычныя часопісы, у якіх можна было публікаваць вынікі сваіх даследаванняў. Да і самі даследаванні былі выкананы ў межах камуністычнай ідэалогіі, а тэматыка абмяжоўвалася галоўным чынам гісторыяй КПСС ці сацыялістычнага грамадства. Каб выдаць кнігу, трэба было прайсці доўгую працэдуру рэцэнзаванне не сколькі навуковую, колькі ідэалагічную, атрымаль ліміт на паперу, чакаць чаргі ў друкарне.

З пачатку 1990-х сітуацыя змянілася. Сучасныя гісторыкі, развіццём лічбавых тэхналогій, Інтэрнэта, зняццем ідэалагічных абмежаваннў маюць непараўнальна больш магчымасцяў публікаваць свае артыкулы, кнігі.

3. *Форма выдання* (даведнік, нарысы). Кожны варыянт мае свае моцныя і слабыя бакі.
4. Крытэрыі вызначэння даследчыкаў (праца ў Віцебску; наяўнасць гістарычнай адукацыі; праца ў ВНУ, публікацыйная актыўнасць; арганізацыя музеяў, удзел у грамадскім жыцці, кіраўніцтва кафедрамі, адміністрацыйная і арганізатарская дзейнасць)
5. Пэўныя складанасці з'яўляюцца ў метадалогіі выяўлення гісторыкаў, інфармацыі пра іх, іх бібліяграфіі (супрацоўнікаў кафедраў ВДУ, ВДПІ імя С.М. Кірава, ПДУ); “Летапіс друку Беларусі”, вусныя інтэрвью.

У любым выпадку, выданне прысвечанае гісторыкам Віцебска, Віцебшчыны, а ў цэлым і грунтоўны даведнік даследчыкаў Беларусі павінна быць падрыхтавана. Гісторыкі гэтага заслугоўваюць.

РЕПОЗИТОРИЙ ВГУ